У Курску 8 чэрвеня адбылося чарговае пасяджэнне Сумеснай рабочай групы па развіцці супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Курскай вобласці Расійскай Федэрацыі

Пасяджэнне прайшло пад старшынствам Сяргея Папкова, кіраўніка беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю, міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Аляксандра Крывалапава, кіраўніка расійскай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Рэспублікай Беларусь, намесніка губернатара Курскай вобласці.

Бакі адзначылі, што сёння рэалізоўваецца План мерапрыемстваў на 2017-2019 гады да Пагаднення ад 25 студзеня 2002 г. паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Адміністрацыяй Курскай вобласці Расійскай Федэрацыі аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, падпісаны 29 ліпеня 2017 года і абмеркавалі актуальныя накіраванні для далейшага развіцця двухбаковых адносін.

Так, з беларускага боку прапанавана вывучыць магчымасць выкарыстання ў Курскім рэгіёне вопыту рэалізацыі праектаў беларускімі будаўнікамі ў Калужскай вобласці, таксама прапрацаваць магчымасць арганізацыі сумесных сортавыпрабаванняў траў і пасадкавага матэрыялу беларускага паходжання і інш.

Адзначана, што па выніках мінулага года тавараабарот паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю склаў больш за 133 млн. даляраў, за чатыры месяцы бягучага года 38 млн. даляраў.

У структуры беларускага экспарту ў курскі рэгіён пераважаюць пастаўкі шын, угнаенняў калійных, нітак комплексных сінтэтычных, аўтамабіляў грузавых, абутку з верхам з натуральнай скуры, галькі, жвіру, друзу, тары пластмасавай, пліт драўнянастружкавых.
За шаснаццаць гадоў дзеяння пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Адміністрацыяй Курскай вобласці і Урадам Рэспублікі Беларусь Губернатар Курскай вобласці А.Н.Міхайлаў сумесна з курскай дэлегацыяй шэсць разоў (2002, 2006, 2010, 2012, 2015, 2017 г.г.) наведваў Беларусь, у рамках дадзеных візітаў праходзілі сустрэчы з кіраўніцтвам Рэспублікі Беларусь на вышэйшым і высокім узроўнях.

Удзельнікі адзначылі высокі ўзровень адносін паміж Курскім рэгіёнам і Беларуссю і выказалі надзею, што партнёрства і ў далейшым будзе заставацца ўзаемавыгадным, плённым і шматгранным.

Даведачна:
З 2009 года за Міністрам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь замацавана Курская вобласць Расійскай Федэрацыі і ўскладзена персанальная адказнасць за прасоўванне нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у гэтым рэгіёне Расіі і актывізацыю двухбаковых адносін.
Міністр сувязі і інфарматызацыі з'яўляецца кіраўніком беларускай часткі Сумеснай рабочай

групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/news/11-06-2018-3201*